ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 10 (327) | Субота, 24 сакавіка 1979 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## У ФОНД МІРУ—УКЛАД КОЖНАГА

**ЗВАРОТ СТУДЭНТАЎ ГІСТОРЫКА-ФІЛАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА ДА ЎСІХ СТУДЭНТАЎ І МОЛАДЗІ ГДУ**

Як вядома, з 7 па 14 красавіка ў нашым універсітэце будзе праводзіцца Тыдзень Фонду міру. Камуністы партгруп, камсамольцы, усе студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта заклікаюць студэнтаў, маладых супрацоўнікаў універсітэта адпрацаваць на адным з прадпрыемстваў Гомеля або вобласці ў Фонд міру, падтрымаць пачын партгрупы гістарычнага аддзялення гістфіла (партгрупорг У. Кананкоў), якая 24 лютага арганізавала суботнік на кандытарскай фабрыцы «Спартак» і зарobленыя 235 рублёў 68 кап. пералічыла ў Фонд міру

**Камуністы і камсамольцы гісторыка-філалагічнага факультэта.**

## ТРАДЫЦЫЙНАЯ СУСТРЭЧА З БЕЛАРУСКІМІ ПІСЬМЕННІКАМІ

Багата пісьменніцкімі талентамі Гомельшчына. Тут вырасла шмат майстроў мастацкага слова, творы якіх вядомы шырокаму чытачу нашай рэспублікі і далёка за яе межамі. Некаторыя з папулярных цяпер аўтараў у свой час вучыліся ў Гомельскім педінстытуце імя В. П. Чкалава, на базе якога дзесяць гадоў таму назад быў створаны наш, другі ў рэспубліцы дзяржаўны універсітэт. Не выпадкова яго калектыў, кафедра беларускай літаратуры, якой загадвае заслужаны дзеяч навукі Беларускай ССР, прафесар, член Саюза пісьменнікаў БССР М. М. Грынчык падтрымліваюць цесную і карысную сувязь з рэспубліканскай пісьменніцкай арганізацыяй. Ужо на працягу некалькіх гадоў ва універсітэце наладжваюцца сустрэчы з празаікамі і паэтамі, драматургамі і літаратуразнаўцамі Беларусі, у час якіх літаратары выступаюць з творчымі справаздачамі перад сваімі чытачамі.

Пры шматлікай аўдыторыі 22-га сакавіка праходзіла ў актавай зале універсітэта чарговая сустрэча з пісьменнікамі беларускай сталіцы. Выкладчыкі, студэнты, супрацоўнікі ГДУ, многія аматары беларускай літаратуры, што прыйшлі з горада на сустрэчу з любімымі аўтарамі, дружнымі апладысментамі віталі дарагіх гасцей. Іх прадставіў прысутным рэктар універсітэта заслужаны дзеяч навукі Беларускай ССР, член-карэспандэнт АН БССР Б. В. Бокуць. На чале з першым сакратаром праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі народным пісьменнікам БССР Іванам Шамякіным універсітэт наведалі на гэты раз народны пісьменнік БССР Максім Лужанін, рэдактар часопіса «Маладосць» Васіль Зуёнак, прафесар БДУ імя У. І. Леніна Ніл Гілевіч, Мікола Аўрамчык, Анатоль Вярцінскі, Пятрусь Макаль, Таісія Бондар, Аляксей Слесарэнка, Раіса Баравікова, Яўген Каршукоў. Сярод гасцей былі таксама дачка памёршага вядомага беларускага пісьменніка Рамана Сабаленкі — Тамара Раманаўна і жонка таленавітага беларускага празаіка Уладзіміра Карпава, якога таксама ўжо няма ў жывых, — Марыя Міхайлаўна.

Аб стане сучаснай беларускай літаратуры расказаў першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Іван Шамякін. Ён таксама падзяліўся ўласнымі творчымі задумамі. Затым са сцэны гучалі вершы, якія чыталі госці, а таксама універсітэцкія аўтары: кіраўнік літаратурнага аб'яднання «Крыніцы», створанага пры кафдры беларускай літаратуры, в. а. дацэнта Віктар Ярац, пачынаючыя паэты, студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта Алена Рыбакова і Анатоль Сыс.

На літаратурнай сустрэчы беларускія пісьменнікі адказалі на зададзеныя ім шматлікія пытанні сваіх чытачоў.

У заключэне рэктар Б. В. Бокуць шчыра падзякаваў пісьменнікаў за іх выступленні, выказаў пажаданне, каб сувязі паміж універсітэцкім калектывам і Саюзам пісьменнікаў БССР працягвалі ўмацоўвацца, уручыў гасцям памятны падарунак.

## АБМЕРКАВАНА НА САВЕЦЕ РЭКТАРАЎ ВНУ

21-га сакавіка адбылося чарговае пасяджэнне Савета рэктараў вышэйшых навучальных устаноў Гомеля і вобласці, у рабоце якога прынялі таксама ўдзел дырэктары тэхнікумаў, прадстаўнікі аблана, загадчыкі райана, дырэктары некаторых сярэдніх школ.

З дакладам аб выніках набору студэнтаў на 1978/79 навучальны год і стану паспяховасці першакурснікаў выступіў старшыня Савета рэктараў ВНУ Гомельшчыны рэктар БІІЧТу прафесар П. А. Сыцко.

З аналагічным дакладам выступіў таксама старшыня Савета дырэктараў сярэдніх спецыяльных устаноў дырэктар Гомельскага дарожна-будаўнічага тэхнікума К. А. Міхальчанка.

У абмеркаванні заслуханых дакладаў прынялі ўдзел прадстаўнікі ўсіх ВНУ нашай вобласці, работнікі сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, народнай асветы. Ад нашага універсітэта выступілі дэкан факультэта фізвыхавання адказны сакратар прыёмнай камісіі мінулага года Б. М. Зайцаў, старшыня прадметнай камісіі па біялогіі В. А. Хількевіч.

На пасяджэнні Савета рэктараў вялася таксама размова аб арганізаванай і якаснай падрыхтоўцы да набору студэнтаў і навучэнцаў сярэдніх навучальных устаноў на новы навучальны год.

## *ПАЗЫЎНЫЯ «ЧЫРВОНАЙ СУБОТЫ»*

## ПАСТАРАЕМСЯ ЎСЕ, ЯК АДЗІН

Кожны год, калі прыходзіць чаканая вясна, прыходзіць да нас і цудоўнае свята — свята працы. Яно бярэ свой адлік з таго памятнага красавіцкага дня 1919 года.

Студэнты біялагічнага факультэта свята захоўваюць памяць аб першым суботніку і кожны год арганізавана выходзяць на свята працы. Сёлета, як і ў мінулыя гады, мы загадзя пачалі рыхтавацца да гэтага важнага мерапрыемства. Створан штаб па правядзенню суботніка. Яго ўзначалілі намеснік дэкана дацэнт І. П. Арабіна і член камсамольскага бюро факультэта А. Чайкоў. Вызначан канкрэтны аб'ём работ. Праўда, у ходзе падрыхтоўкі да свята працы будуць уносіцца пэўныя карэктывы і дапаўненні. Асноўны аб'ём работ будзе вызначан адміністрацыйна-гаспадарчай часткай універсітэта. Акрамя таго, студэнты-біёлагі будуць заняты на добраўпарадкаванні тэрыторыі універсітэта, уборцы тэхнічных лабараторый і аўдыторый.

Студэнты нашага факультэта правядуць свята на высокім арганізацыйным узроўні.

**Л. СЁМКІНА,**
**сакратар камсамольскага бюро біялагічнага факультэта.**

*Партыйнае жыццё*

## У ПАРТКОМЕ

На гэтым тыдні ў сераду адбылося чарговае пасяджэнне партыйнага камітэта універсітэта. Па дакладах сакратароў партбюро Л. Я. Палякова з матфака і С. П. Ажгірэя з геафака абмеркавана пытанне аб выкананні рашэння парткома ГДУ ад 15 сакавіка 1978 года «Аб рабоце куратараў матэматычнага і геалагічнага факультэтаў па павышэнню якасці ведаў і грамадскай актыўнасці студэнтаў».

Па дакладу сакратара партбюро гісторыка-філалагічнага факультэта А. К. Няронскай абмеркавана пытанне «Аб рабоце партыйнай арганізацыі гісторыка-філалагічнага факультэта па падбору, расстаноўцы і выхаванню кадраў».

Партком зацвердзіў камісію па падрыхтоўцы і правядзенню Усесаюзнага камуністычнага суботніка, план работы рэдакцыі шматтыражнай газеты «Гомельскі універсітэт» на другі квартал бягучага года, разгледзеў іншыя пытанні.

## З УЗНАГАРОДАЙ!

**За шматгадовую плённую навукова-педагагічную дзейнасць і ў сувязі з 60-годдзем з дня нараджэння загадчык кафедры палітэканоміі нашага універсітэта МАЕРАЎ Мікалай Мікалаевіч Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.**

## ДЛЯ ПАВЫШЭННЯ АКТЫЎНАСЦІ

На кожным факультэце існуе нямала грамадскіх арганізацый. Аднак не ўсе яны працуюць з належнай актыўнасцю, іншы раз іх работа застаецца па-за ўвагай камуністаў. Такіх фактаў імкнуцца не дапусціць на эканамічным факультэце. Вось чаму на партыйным сходзе, які адбыўся на гэтым тыдні, па-дзелавому і прынцыпова абмяркоўвалася пытанне аб ролі партыйнай арганізацыі ў кіраўніцтве работай грамадскіх арганізацый, павышэнні яе эфектыўнасці ва ўсіх сферах факультэцкага жыцця.

З дакладам выступіў член КПСС Г. К. Котаў. Ён, а таксама выступіўшыя ў спрэчках намеснік дэкана А. В. Нявераў, ленінская стыпендыятка Л. Краснагір, нам. сакратара камітэта камсамола універсітэта А. Сенін, іншыя камуністы вялі канкрэтную размову аб тым, як палепшыць партыйнае кіраўніцтва і павысіць баяздольнасць усіх грамадскіх арганізацый факультэта, на што і накіравана прынятая на сходзе пастанова.



**15—16 сакавіка на біялагічным факультэце была праведзена выстаўка навуковай і мастацкай творчасці студэнтаў, якая прымяркоўвалася да студэнцкай навуковай канферэнцыі біяфака па выніках работы за 1978 год.**

**НА ЗДЫМКУ: студэнты аглядаюць экспанаты выстаўкі.**

Фота Б. Шкурко.

## АБ АНТЫНАРОДНАЙ СУТНАСЦІ МААІЗМУ

Днямі студэнты, якія жывуць у інтэрнаце № 2, сабраліся на лекцыю «Антынародная сутнасць мааізму». Яе прачытаў кандыдат гістарычных навук дацэнт кафедры гісторыі КПСС А. П. Мяшчэрскі. Ён расказаў аб палітыцы правячых колаў Кітая, даказаў усю неабгрунтаванасць дзеянняў кітайскай ваеншчыны ў адносінах да міралюбівага в'етнамскага народа. Больш месяца на гераічнай зямлі в'етнамскага народа, палітай крывёю яго многіх патрыётаў, вядзецца ўпартая барацьба за свабоду і незалежнасць. Кітайскія лідэры спрабуюць прыкрывацца ілжывымі выдумкамі, нібыта ваенныя дзеянні іх арміі носяць далёка не захопніцкі, а абарончы характар. Аднак гэта супярэчыць існаму становішчу спраў. Прагрэсіўная грамадскасць міралюбівых краін, і ў першую чаргу Савецкага Саюза, гнеўна асудзіла кітайскую агрэсію. Савецкія людзі, як і народы іншых краін, патрабуюць хутчэйшага вываду кітайскіх войск з усёй тэрыторыі сацыялістычнага В'етнама.

А. П. Мяшчэрскі адказаў на шматлікія пытанні слухачоў. У знак памяці аб гэтай сустрэчы студэнты ўручылі лектару падарунак.

(Наш кар.).

*Нашы юбіляры*

# ПА ЖЫЦЦІ — З АПТЫМІЗМАМ

На гэтым тыдні споўнілася 50 гадоў з дня нараджэння старшай выкладчыцы кафедры галіновых эканомік Ніны Васільеўны Волкавай. Адначасова яна адзначыла і яшчэ адзін юбілей — 25-годдзе сваёй педагагічнай дзейнасці.

Ніна Васільеўна нарадзілася ў сціплай рабочай сям'і на Тамбоўшчыне. У 1947 годзе закончыла Мічурынскі сельскагаспадарчы тэхнікум і з дыпломам агранома была накіравана на працу ў Магілёўскую вобласць. Той час яна ўспамінае з горычу: разбураныя вёскі, заросшыя бур'янам палі, бясхлебіца. У такіх умовах без якіх-небудзь тэхнічных сродкаў даводзілася знясіленым вайной людзям аднаўляць разбураную гаспадарку.

Затым жыццёвыя дарогі прывялі Ніну Васільеўну на поўдзень краіны — у сонечны Таджыкістан. Відавочна, працяглыя і неаднаразовыя падарожжы па Савецкаму Саюзу і адыгралі першаступеннае значэнне для далейшага выбару месца ў жыцці. Ніна Васільеўна паступае на геаграфічны факультэт Душанбінскага педінстытута імя Т. Р. Шаўчэнкі.

У 1954 годзе пачынаецца педагагічная дзейнасць Н. В. Волкавай. Яна выкладае геаграфію ў сярэдняй школе аднаго з таджыкскіх кішлакоў.



Праз некаторы час маладая настаўніца зноў едзе ў Беларусь. Тут, спачатку працуючы ў Мазыры, а затым у Гомельскім чыгуначным тэхнікуме, яна авалодвае высокім педагагічным вопытам. У 1971 годзе па конкурсу Ніна Васільеўна пераходзіць на працу ў Гомельскі дзяржуніверсітэт. З таго часу яна нязменна працуе на эканамічным факультэце.

Амаль чвэрць стагоддзя Н. В. Волкава ў радах КПСС. Шмат часу і сіл яна аддае партыйнай рабоце. Ніна Васільеўна неаднаразова выбіралася членам і сакратаром партыйнага бюро, членам прафбюро факультэта, выконвала многія іншыя даручэнні.

Маладыя спецыялісты-эканамісты, пачынаючы з першага выпуску 1974 года, з павагай і цеплынёй успамінаюць любімую выкладчыцу, клапатлівага куратара, добрага і прынцыповага выхавацеля — Ніну Васільеўну Волкаву. Яе заняткі па аднаму з самых захапляльных прадметаў — эканамічнай геаграфіі — заўсёды карыстаюцца папулярнасцю сярод слухачоў падрыхтоўчага аддзялення, першакурснікаў.

Ніна Васільеўна часта выступае з лекцыямі і дакладамі на навуковых семінарах і канферэнцыях, мае навуковыя публікацыі, шырока прапагандуе геаграфічныя і эканамічныя веды.

У 1976 годзе Н. В. Волкава абрана правадзейным членам Геаграфічнага таварыства СССР.

Віншуючы Ніну Васільеўну Волкаву з 50-годдзем з дня нараджэння, выкладчыкі і супрацоўнікі, студэнты і слухачы падрыхтоўчага аддзялення сардэчна жадаюць ёй моцнага здароўя, актыўнага даўгалецця, новых поспехаў у навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці на карысць сацыялістычнай Радзімы!

**Я. ВЯРШЫГАРА,**
**в. а. сакратара партбюро эканамічнага факультэта.**
**У. ПАШУК.**

# БЫЦЬ ЦІ ЗДАВАЦЦА?

Чым шырэйшыя магчымасці набыцця рэчаў, тым большай культуры патрабуе іх выбар. Асабліва гэта датычыцца адзення, нашы «ўзаемаадносіны» з якім заключаюць у сабе не толькі эстэтычныя, але і этычныя тонкасці. На вуліцы, на рабоце, на экране тэлевізара, у самалёце, на пляжы — усюды, дзе дзейнічаюць людзі, «прысутнічае» і адзенне. І яно, часам, незалежна ад нашага жадання, а то і зусім насуперак яму, паведамляе навакольным многае аб густах, характары, звычках, ступені выхаванасці ўладальніка...

Тысячагадовая практыка супольнага жыцця людзей усклала на касцюм шматлікія функцыі і «абавязкі». Людзі заўсёды імкнуліся не толькі зрабіць яго максімальна зручным, але і выпрацаваць мастацкія формы адзення, якія з'явіліся б, калі можна так сказаць, знешнім эквівалентам асаблівасцей, рыс характару. Некалі касцюм сведчыў і аб сацыяльнай прыналежнасці гаспадара. Не выпадкова пакрой і фасон адзення ,яго стыль з даўняе пары называюць «візітнай карткай» эпохі. Як жа гэта картка выглядае сёння, што ў першую чаргу адлюстроўвае, якім тэндэнцыям падуладна?

Канулі ў Лету гарнастаевыя мантыі і крыналіны, трэвуголкі і цыліндры, пурпурныя тогі, вянкі трыумфатараў. Вянкі спартсменаў і мантыі акадэмікаў успрымаюцца не інакш як сімвалы грамадскіх заслуг, асаблівых дасягненняў, але не як знакі сацыяльных бар'ераў. У нас у краіне сучасны касцюм заслужана называюць «дэмакратычным». У ім адсутнічаюць формы, тыпы, дэталі, прадпісаныя адным і забароненыя другім.

І ўсё ж такі касцюм, як неад'емная частка нашага знешняга выгляду, утрымлівае ў сабе і сёння нямала сведчанняў аб сваім гаспадары.

Бадай, першае, аб чым заўсёды адкрыта гаворыць адзенне,—гэта аб самаацэнцы чалавека. Праўда, не вычарпальна, але часам вельмі красамоўна. Адны імкнуцца апранацца як мага непрыкметней, нічым не звяртаць на сябе ўвагу, другія выбіраюць усё самае яркае, кідкае, трэція асабліва клапоцяцца аб умеркаванасці, стараючыся не растварацца на агульным фоне, але разам з тым і не вызначацца вельмі рэзка, чацвёртыя клапоцяцца, каб адзен не прыдавала ім прывабнасць, як гавораць, ішло да твару і фігуры. Іншыя хвалююцца аб узросце, аб паўнаце, аб займаемым становішчы або матэрыяльным дастатку, выбіраючы толькі «салідныя» або відавочна дарагія рэчы. Гэтыя асаблівасці распазнаюцца даволі лёгка.

Але ёсць яшчэ і іншыя погляды на выкарыстанне адзення. Напрыклад, з дапамогай вопраткі можна прыдаць сабе адсутнічаючыя ўласцівасці і якасці. Бо адзенне да вядомай ступені дазваляе чакавеку не толькі выказваць сябе, але і набываць выгляд таго, кім ён на самай справе не з'яўляецца. Іншы, карыстаючыся гэтым, цалкам можа кагосьці ўвесці у блытаніну. Праўда, не па аднаму толькі касцюму мяркуем мы аб людзях. Існуюць жэсты, словы, учынкі нарэшце. Але каб разабрацца ва ўсім гэтым, патрэбен час. Касцюм жа гіпнатызуе, часам, імгненна. Нездарма ж народная прыказка гаворыць: «Сустракаюць па адзенню, праводзяць па розуму».

Складаныя «ўзаемаадносіны» чалавека з касцюмам... І не дзіўна. Часам даволі проста пашыты кавалак тканіны здолен «апавясціць» навакольных аб прынцыпах свайго гаспадара, ці хоча той «быць» або ж толькі «здавацца», думае толькі аб сабе ці клапоціцца аб іншых, мае высакародныя намеры ці падкі на мішуру. Нярэдка можна сустрэць з асаблівй акуратнасцю прыбраную жанчыну, умела падкрэсліўшую касцюмам, прычоскай прыгожыя рысы твару, фігуру, але, як вынікае ўжо з першых хвілін знаёмства, усё гэта праароблена дзеля эфекту. Пачынаеш думаць, што і ў навакольных людзях яна перш за ўсё цэніць гэткую дэкаратыўнасць.

А вось зваротны прыклад. Сярод добра апранутых людзей у тэатры з'яўляецца малады чалавек у заляпаных граззю, стаптаных чаравіках, нясвежай кашулі. Ён развязна плюхаецца ў крэсла, пачынае круціцца направа і налева, бесцырымонна разглядаючы суседзяў, адшукваючы знаёмых, кагосьці штурхаючы локцямі. І адразу бачна — адзенне і характар зліліся ў адно цэлае, якое дэманструе грэбаванне да ўсіх і да ўсяго.

Але гэтыя прыклады, бадай, вельмі відавочныя. Складаней ўзаемаадносіны паміж настаўніцай у сукенцы крыху ўстарэўшай моды і дзевяцікласніцамі ў дарагіх экстравагантных боціках і ў прытворна скромных фартухах.

«Здавацца» — крэда тых, хто наогул слепа капіруе ўзоры чужой знешнасці, хто змяняе фасон паліто, каб «замяніць» свой воблік чыімсьці прывабным па розных думках. Значыць, ты заведама недаацэньваеш уласныя магчымасці, табой рухаюць раз'ядаючая зайздрайсць, кліентура спекулянтаў. На іх нажываюцца несумленныя людзі, якія прышываюць ярлыкі замежных фірм да ўцэненых рэчаў, самашытых і самавязаных вырабаў. І не ведаюць спажыўцы такіх рэчаў, што касцюм можа стаць сапраўдным творам мастацтва, атрымаць поўную завершанасць толькі пры гарманічным зліцці з унутраным зместам чалавека, а не толькі з яго фігурай, ростам.

Мода ў нас адыгрывае цалкам дастойную ролю ва ўпрыгожанні людзей, задавальненні іх эстэтычных патрабаванняў, адлюстроўвае іх жыццёвыя ўмовы. Новую моду, як правіла, з цікавасцю, нават з вясёлым азартам прымаем мы ў большасці сваёй, пряўляем заканамерную цікавасць як навогул да любой новай падзеі, спрабуючы разабрацца ў ёй, выбраць тое, што можа быць карысным для нас, спрабуем абдумаць і нават прыўнесці ў яе нешта сваёй. Той, хто прымае моду бяздумна, хто хоча толькі здавацца смелым у выбары, той проста эксплуатуе моду, а часцей дыскрэдытуе яе. І сябе таксама.

Ідзеш нядзельнай вуліцай — здаецца, увесь горад рухаецца табе насустрач. Людзі вясёлыя і сур'ёзныя, у стракатых і яркіх уборах, у строгіх «службовых» касцюмах. Думаеш, угадваючы па адзенню: гэты — адпускнік, гэты — дачнік, а гэтаму і сёння знайшлася работа... Касцюмы непадобныя, розныя, але ў большасці выпадкаў яны «да твару». Яны гарманіруюць з чалавекам, дапаўняюць яго, робяць чалавека больш высакародным. Да гэтага і павінны мы імкнуцца.

**І. АНДРЭЕВА,**
**галоўны мастацтвазнавец Усесаюзнага інстытута асартыменту вырабаў лёгкай прамысловасці і культуры адзення.**

**Ад рэдакцыі:**

**Публікуючы гэты артыкул, рэдакцыя запрашае чытачоў да размовы на старонках газеты «Гомельскі універсітэт» аб сучасных модах, адносінах да іх студэнцкай моладзі.**

*Пад вострым вуглом*

# ДЫМ У КАЛІДОРАХ

Усім вядома, што загады існуюць для таго, каб іх выконваць. На жаль, выконваюцца яны не ўсюды. Прыклады? Прайдзіце калі-небудзь у перапынках паміж заняткамі па калідорах і лесвічных пляцоўках вучэбнага корпуса № 2 і вы адразу ўсе зразумееце. А каб было зразумела і чытачам — растлумачым. У гэтым навучальным годзе загадам рэктара універсітэта Б. В. Бокуця было забаронена курыць на калідорах і лесвічных пляцоўках. Для гэтага адведзены спецыяльныя месцы. Як жа выконваецца загад? Мусім прызнаць — не ўсімі. У аднаго студэнта, які смачна «зацягваўся» прама ля аўдыторыі, мы спыталі:

— Чым вы матэвуеце непадпарадкаванне загаду рэктара?

— А хіба я адзін? — Вунь колькі «смаляць цыгаркі», — адказаў ён.

Прозвішча студэнта мы не называем, бо на яго месцы мог аказацца любы іншы, які, мабыць, і адказаў бы прыкладна так. Хвалюе іншае — за недазволенае курэнне няма каму строга спытаць з парушальнікаў парадку. Горш таго, назіраюцца выпадкі курэння ў недазволеных месцах і сярод некаторых выкладчыкаў.

Аналагічнае становішча можна назіраць і ў вучэбным корпусе № 1, дзе займаюцца студэнты факультэта фізвыхавання, гістфіла і біяфака. Курыльшчыкі атручваюць свае лёгкія і яшчэ больш — акружаючых.

Дыму ў калідорах вучэбных карпусоў не павінна быць! А з тых, на каго не дзейнічае загад, павінны строга спытаць у дэканатах, на камсамольскіх сходах. Інакш — нельга!

**З. ШАЎЦОВА.**

# КУДЫ ЗНІКАЮЦЬ РЭЧЫ?

Кажуць, у апошні час усё менш студэнтаў наведваюць сталоўку універсітэта. Доўга ніхто не мог даведацца, у чым тут справа.

А яна вось у чым. У некаторых студэнтаў у той час, як яны спакойна стаялі ў чарзе за абедам, а потым сілкаваліся, невядома па якой прычыне знікалі вопратка і асабістыя рэчы. Спачатку думалі, што гэта няйначай, як жарты сяброў. Але потым высветлілася, што жартаваць ніхто і не думаў. Каб не быць галаслоўнымі, прывядзем прыклад. Студэнты гістфіла Г. Мурачок і М. Бондар прыйшлі ў сталоўку, каб падсілкавацца. Распрануліся, пакінуўшы вопратку і «дыпламаты» у абедзенным зале, а самі сталі ў чаргу. Падсілкаваліся і прыйшлі апранацца. А «дыпламаты» як карова языком злізала. Спрабавалі звярнуцца да прадстаўнікоў адміністрацыі, але тыя толькі паціскалі плячыма.

Прыведзены факт — не выпадковасць. Аб гэтым сведчаць аб'явы прыкладна такога зместу: «Хто «памылкова» узяў мае рэчы, прашу вярнуць адміністрацыі сталоўкі»... Аднак, па сведчанню прадстаўнікоў той жа адміністрацыі, ніхто яшчэ не вяртаў «зніклыя» рэчы. Пацярпеўшым некаторыя таварышы раяць: скардзіцеся. Але, прабачце, на каго?

На нашу думку, вінаватая ва ўсім адміністрацыя сталоўкі, якая да гэтага не наладзіла работу гардэроба.

**А. ВАСІЛЬЕЎ.**

# ЧАКАЕМ... НЕ ДАЧАКАЕМСЯ

Клопаты работнікаў адміністрацыйна-гаспадарчай часткі накіраваны на стварэнне належных умоў для вучобы і адпачынку студэнтаў. Аднак у апошні час клопатаў гэтых, мякка кажучы, не заўважаецца. Справа ў тым, што ў нашым інтэрнаце № 2 ужо больш месяца не мяняюць бялізну. І нікога гэта пакуль што не турбуе. Кастэлянша З. А. Цімафеева знаходзіцца на двухмесячным санаторным лячэнні. Замяніць яе мог бы любы іншы тэхнічны работнік інтэрната. Аднак на гэта не даюць дазволу ў АГЧ. Студэнтам прыходзіцца спаць на брудных навалачках і прастынях. Да якога ж часу будзе цягнуцца такая безгаспадарчасць?

**Жыхары інтэрната № 2.**

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

АЗ 50243 «Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Палеедрук» Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Наш адрас: вул. Кірава, 119, корпус № 2. П 4-8, т. 6-27-71. Фармат 600×420 мм. Тыраж 2000 экз. Заказ 1633